ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 13 (185) | Субота, 13 красавіка 1974 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.



Рамантычная прафесія геолага. Добра авалодаць ёй можа толькі той, хто набудзе трывалыя тэарэтычныя веды і замацуе іх на практыцы.

На гэтым здымку вы бачыце студэнтаў чацвёртага курса геалагічнага факультэта, якія пад кіраўніцтвам дацэнта М. К. Бабкова выконваюць лабараторныя заняткі па тэхналогіі меліярацыі глебы.

Фота А. Рудчанкі.

НА ПЛЕНУМЕ КАМІТЭТА ЛКСМБ

## БАЯВАЯ ЗАДАЧА КАМСАМОЛА

На мінулым тыдні ў актавай зале ўніверсітэта адбыўся пленум камітэта камсамола. На яго былі запрошаны камсоргі груп, члены камсамольскіх і прафсаюзных бюро факультэтаў, іншыя актывісты.

На пленуме абмеркавана пытанне «Аб рабоце пярвічных камсамольскіх арганізацый універсітэта па падрыхтоўцы да 50-годдзя з дня прысваення піянерскай арганізацыі імя У. І. Леніна». З дакладам выступіла адказная за шэфскі сектар ГДУ студэнтка гісторыка-філалагічнага факультэта Л. Артамонава.

— Больш як паўстагоддзя гучаць над краінай пазыўныя горнаў, чуцен пошчак піянерскіх барабанаў, — зазначыла дакладчык, — больш як паўстагоддзя раздаецца па-вясноваму чысты і бадзёры голас: «Будзь гатовы!» Шмат цікавых спраў на рахунку савецкай піянерыі, у выкананні якіх немалаважную ролю мае дапамога старэйшых сяброў-камсамольцаў.

Вялікую работу з юнымі ленінцамі праводзяць студэнты ўніверсітэта. Яна ажыццяўляецца праз гарадскія і сельскія школы, домакіраўніцтвы, дзіцячыя пакоі міліцыі і г. д. Важатыя гісторыка - філалагічнага, біёлага - глебавага, механіка-матэматычнага факультэтаў шмат увагі ўдзяляюць піянерскаму актыву падшэфных атрадаў. Яны дапамагаюць ім распрацоўваць сацыялістычныя абавязацельствы і афармляць атрадныя дзённікі ў гонар 50-годдзя з дня прысваення піянерскай арганізацыі імя У. І. Леніна, рыхтуюць сумесныя цікавыя зборы.

У дакладзе прыводзіліся і іншыя факты канкрэтнай мэтанакіраванай дапамогі камсамоліі сваёй юнай змене. І гэта добра, бо ганаровы абавязак членаў ВЛКСМ — рыхтаваць у свае рады дастойнае папаўненне.

Адначасова як дакладчык, так і выступіўшыя на пленуме гаварылі аб павышэнні эфектыўнасці дапамогі піянерскім арганізацыям, асабліва сельскіх школ. Гэтаму пытанню было прысвечана выступленне члена парткома, кандыдата педагагічных навук А. В. Саннікавай, якая расказала аб шляхах павышэння эфектыўнасці выхаваўчай работы студэнтаў у школе. Людміла Несцярок гаварыла аб вопыце работы студэнтаў гісторыка-філалагічнага факультэта ў падшэфных школах. Святлана Кісялёва сваё выступленне прысвяціла пытанню дапамогі студэнтаў у павышэнні агульнаадукацыйнага ўзроўню рабочай моладзі.

Аб рабоце студэнтаў пры дзіцячым пакоі міліцыі расказала Валянціна Якаўлева, аб дзейнасці педагагічнага клуба «Сэрца аддаю дзецям» — Таццяна Барадзіна.

Цікавымі і змястоўнымі былі выступленні і іншых удзельнікаў пленума. Яны не толькі дзяліліся вопытам, расказвалі аб рабоце сваіх таварышаў, але і засяроджвалі ўвагу на нявырашаных пытаннях.

Пленум прайшоў па-дзелавому, арганізавана. Прынятая ім пастанова накіравана на далейшае паляпшэнне работы пярвічных камсамольскіх арганізацый універсітэта па падрыхтоўцы да знамянальнага юбілея савецкай піянерыі.

## ЛЕКЦЫІ ЛЕНІНГРАДСКАГА ВУЧОНАГА

У гэтым месяцы жаданым госцем нашага ўніверсітэта была загадчык кафедры педагогікі і псіхалогіі Ленінградскага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар педагагічных навук, прафесар Ніна Васільеўна Кузьміна. Цёпла віталі яе на кафедры педагогікі і псіхалогіі ГДУ. Чатыры дні Ніна Васільеўна чытала лекцыі для выкладчыкаў кафедры педагогікі і псіхалогіі аб метадах навуковага даследавання ў галіне педагогікі, праводзіла кансультацыі. Студэнты 3-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта і 4-га курса фізвыхавання таксама з задавальненнем слухалі яе лекцыі аб станаўленні педагагічнага майстэрства, аб педагагічных здольнасцях. Акрамя гэтага, ёю была прачытана лекцыя аб педагагічным майстэрстве для настаўнікаў гомельскіх школ.

Ніна Васільеўна засталася задаволенай нашымі людзьмі і цудоўным вясновым горадам на Сожы.

**У. КАСЦЮКЕВІЧ.**

## РУКУ — НА СПАБОРНІЦТВА

**Важны ўклад у паспяховае ажыццяўленне праграмы эканамічнага і сацыяльна-палітычнага развіцця краіны, выпрацаванай XXIV з'ездам КПСС, заклікана ўнесці савецкая вышэйшая школа, Ленінскі камсамол. У гэтай справе асаблівая роля надаецца студэнцкім будаўнічым атрадам, байцы якіх паспяховую вучобу спалучаюць з плённай працай.**

**У студэнцтва новы прыліў сіл і энергіі выклікала пастанова IX пленума ЦК ВЛКСМ аб прысваенні Ўсесаюзнаму студэнцкаму будаўнічаму атраду імя XVII з'езда ВЛКСМ.**

**Каб дасягнуць высокіх паказчыкаў у сёлетнім працоўным семестры, студэнцкія будаўнічыя атрады нашага ўніверсітэта і Беларускага інстытута інжынераў чыгуначнага транспарту заключылі паміж сабой дагавор на сацыялістычнае спаборніцтва і ўзялі высокія сацыялістычныя абавязацельствы. Яны разлічаны на падрыхтоўчы і рабочы перыяды. Акрамя вытворчай праграмы, імі прадугледжана шырокая агітацыйна-масавая, прапагандысцкая, выхаваўчая, ваенна-патрыятычная і шэфская работа, удзел ва Ўсесаюзным агітпаходзе студэнцкай моладзі і іншых мерапрыемствах.**

### ● СТУДЭНЦКІЯ БУДАЎНІЧЫЯ РЫХТУЮЦЦА ●

**СБА нашага ўніверсітэта абавязаліся асвоіць сёлета капіталаўкладанняў на 800 тыс. рублёў, пры гэтым атрымаць не менш тысячы рублёў эканоміі ад укаранення рацыяналізатарскіх прапаноў. Байцы атрадаў абавязаліся прыняць актыўны ўдзел ва Ўсесаюзных студэнцкіх нядзельніках і пералічыць у гэты фонд тры тысячы рублёў. На месцах дыслакацыі запланавана адрамантаваць 5 школ, абсталяваць 20 спартыўных пляцовак, 10 кабінетаў, арганізаваць пяць кансультацыйных пунктаў і два піянерскія лагеры-спадарожнікі.**

**Высокія рубяжы вызначылі для сябе і байцы СБА БІІЧТу.**

**Падпісаўшыя дагавор сакратары камітэтаў камсамола, начальнікі і камісары штабаў працоўных спраў, камандзіры і байцы атрадаў запэўнілі абласны камітэт ЛКСМБ, што ўзятыя сацыялістычныя абавязацельствы на працоўны семестр вызначальнага года дзевятай пяцігодкі будуць выкананы з гонарам.**

### ВІНШУЕМ!

**Калектыў выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў эканамічнага факультэта горача віншуе выкладчыка кафедры галіновых эканомік ЗУБКОВА Эдуарда Уладзіміравіча з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата эканамічных навук.**

## ГЕОЛАГІ АДЗНАЧЫЛІ СВЯТА

У мінулую суботу выкладчыкі і студэнты геалагічнага факультэта адзначылі сваё свята — Дзень геолага. Яны правялі факультэцкі «Агеньчык» пад дэвізам: «Тайга чакае заўтра, а пакуль — утульнасць вячэрняга «Агеньчыка».

Урачыстую частку адкрыў дэкан факультэта Ю. Ф. Хадакоўскі. Ён павіншаваў прысутных са святам, пажадаў выпускнікам факультэта плённых здабыткаў у пошуках прыродных багаццяў і развіцці геалагічнай навукі. Цёплыя словы выказаў Юрый Фёдаравіч і ў адрас першакурснікаў, галоўная задача якіх — добра вучыцца, каб стаць сапраўднымі разведчыкамі зямных нетраў.

На вечары выдатнікам вучобы былі ўручаны нагрудныя значкі ЦК ВЛКСМ і Міністэрства вышэйшай, сярэдняй і спецыяльнай адукацыі СССР.

Студэнты-геолагі не толькі настойліва авалодваюць навукай, але і актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім і спартыўным жыцці ГДУ. Спартыўны клуб універсітэта ўзнагародзіў лепшых спартсменаў факультэта граматамі. Іх атрымалі Н. Кузняцова, У. Афанасенка, А. Блудаў і іншыя. За актыўную грамадскую дзейнасць граматамі ўніверсітэта ўзнагароджаны У. Шаўцоў, С. Абрамаў, Г. Карповіч і іншыя. Вядомы вучоны, загадчык кафедры гідрагеалогіі і інжынернай геалогіі, прафесар В. Г. Герасімаў расказаў на вечары аб нялёгкай, але пачэснай працы геолагаў. Ён звярнуў увагу будучых спецыялістаў на тыя задачы, якія пастаўлены перад геалогіяй XXIV з'ездам КПСС, расказаў пра поспехі па разведванню вялікіх багаццяў палескай зямлі.

На «Агеньчыку» гучалі студэнцкія песні, музыка, праводзіліся цікавыя гульні.

**А. ЛОЗКА.**

НА ТЭМАТЫЧНЫМ ВЕЧАРЫ

## МАЦАВАЦЬ ПАЛІТЫЧНУЮ ПІЛЬНАСЦЬ

Упэўнены поступ нашай краіны па шляху да камунізму. У свеце ўжо няма сіл, якія б маглі пахіснуць яе магутнасць. І з гэтым ніяк не могуць змірыцца рэакцыйныя элементы аджываючага імперыялізму. Яны імкнуцца выкарыстаць усе сродкі і магчымасці, каб пашкодзіць хутчэйшаму ажыццяўленню запаветаў вялікага Леніна, затармазіць рэвалюцыйны рух за сацыяльны прагрэс, незалежнасць і шчасце ўсіх народаў.

Ворагі сацыялізму і камунізму спрабуюць аказаць асаблівы ўплыў на моладзь, якой належыць будучыня. Яны імкнуцца атруціць маладыя сэрцы ядам буржуазнай ідэалогіі, рэлігійным дурманам, выбіць са свядомасці марксісцка-ленінскае вучэнне.

Савецкія людзі, наша слаўная моладзь даюць рашучы адпор усім рэакцыйным падкопам. Аднак, на жаль, яшчэ і ў нас не-не, ды сустракаюцца асобы, якія ў меру сваёй палітычнай незагартаванасці трапляюць на вуду заходняй прапаганды. Гэта нас не можа не трывожыць. Каб не было падобных з'яў, патрабуецца ўзняць ідэйна-выхаваўчую работу яшчэ на больш высокі ўзровень. Адна з эфектыўнейшых яе форм — тэматычныя вечары. Іх правядзенню пачалі надаваць вялікую ўвагу ў нашым універсітэце.

Асабліва шмат студэнтаў і выкладчыкаў прысутнічала на тэматычным вечары «Антыкамунізм — ідэалагічная зброя імперыялізму». Уступным словам вечар адкрыў намеснік сакратара парткома, кандыдат гістарычных навук В. В. Серыкаў. Ён адзначыў тую велізарную ролю ідэйна-палітычнага выхавання моладзі, якая надаецца на сучасным этапе камуністычнага будаўніцтва ў гістарычных рашэннях XXIV з'езда КПСС.

На вечары з вялікай увагай было выслухана выступленне намесніка начальніка ўпраўлення Камітэта Дзяржбяспекі пры Савеце Міністраў БССР па Гомельскай вобласці У. Ф. Кузьміна. Прыведзеныя ім прыклады яскрава засведчылі тое, што толькі слаба выхаваныя, маральна няўстойлівыя, разбэшчаныя людзі схіляюцца на бок буржуазнай прапаганды. І нельга было не засмучацца, што сярод такіх называліся прозвішчы маладых людзей Гомельшчыны, якім савецкая краіна дала вышэйшую адукацыю, хто добра матэрыяльна забяспечаны.

У ліку маральна апушчаных людзей сустракаюцца і студэнты. Іх лёс павінен усхваляваць кожнага камсамольца. Мы павінны дабівацца маральнай чысціні, высокай свядомасці, непахіснай перакананасці кожнага чалавека ў жыццесцвярджальнасці марксізму-ленінізму.

З неаслабнай увагай удзельнікі вечара праслухалі і выступленне старшага выкладчыка кафедры філасофіі А. А. Фяськова, які падзяліўся ўражаннямі ад турысцкай паездкі па капіталістычных краінах Еўропы. Прыведзеныя ім факты пераканаўча засведчылі, як прапагандысцкія колы Захаду імкнуліся ўсялякімі спробамі і запалохваннем схіліць савецкіх людзей на свой бок. Адначасова ён гаварыў аб тым, да якой маральнай апустошанасці прыводзіць моладзь капіталістычных краін пад уздзеяннем буржуазнай прапаганды і рэлігійнага адурманьвання так званы «свабодны лад жыцця».

Аб незайздросным становішчы французскай моладзі на вечары расказаў студэнт эканамічнага факультэта Уладзімір Дзюбо, які сёлета ў саставе беларускай дэлегацыі ўдарнікаў студэнцкіх будаўнічых атрадаў зрабіў турыстычнае падарожжа па Францыі.

Для ўдзельнікаў тэматычнага вечара былі паказаны дакументальныя кінастужкі аб спробах шляхам шпіянажу і знешніх падкопаў нанесці шкоду нашай сацыялістычнай Айчыне.

**Б. ВАЛОДЗІН.**

**СТАРОНКА ДЛЯ АБІТУРЫЕНТАЎ**

# ЗАПРАШАЕ НА ВУЧОБУ ЭКАНАМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ



*ЗНАЁМЦЕСЯ СА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯМІ*

## ІНЖЫНЕР-ЭКАНАМІСТ ПА АРГАНІЗАЦЫІ МЕХАНІЗАВАНАЙ АПРАЦОЎКІ ЭКАНАМІЧНАЙ ІНФАРМАЦЫІ

Для работы на электронна-вылічальных машынах і рашэння на іх эканамічных задач трэба спецыялісты, якія добра ведаюць эканамічныя законы развіцця грамадства і ў той жа час выдатна валодаюць навейшымі дасягненнямі матэматыкі і электронна-вылічальнай тэхнікі. Падрыхтоўка такіх кадраў ажыццяўляецца на нашым факультэце па вочнай і завочнай формах навучання.

Для авалодвання гэтай спецыяльнасцю адначасова з веданнем агульнатэарэтычных дысцыплін неабходна разбірацца ў эканамічнай матэматычнай і інфармацыйнай сутнасці задачы, якая патрабуе машыннага рашэння. Трэба ўмець матэматычна сфармуляваць яе, знайсці і прымяніць апарат для аптымальнага рашэння любой задачы, распрацаваць алгарытм рашэння і запісаць яго, ужыўшы адну з алгарытмічных моў. Яшчэ важна навучыцца праектаваць і арганізоўваць праектаванне эфектыўных інфармацыйных сістэм на ўдасканаленых прамысловых прадпрыемствах і арганізацыях, складаць і наладжваць праграму для ЭВМ.

У працэсе вучобы будучыя спецыялісты павінны навучыцца самастойна працаваць на падлікова-таблічных, вылічальна - перфарацыйных, электронна-вылічальных машынах і праводзіць іх наладку для рашэння эканамічнай задачы. Яны павінны добра ведаць эксплуатацыйныя ўласцівасці сродкаў аргтэхнікі і вылічальных машын, якія выкарыстоўваюцца для збору, захавання, размнажэння, адлюстравання і перадачы даных, а таксама ўмець ацэньваць характар любой эканамічнай задачы з пункту гледжання магчымасцей яе эфектыўнага рашэння пры дапамозе вылічальнай тэхнікі. Спецыяліст павінен добра ведаць тэхналогію механізаванай апрацоўкі даных, валодаць навыкамі кіраўніцтва вылічальным цэнтрам і яго падраздзяленнямі.

Для замацавання тэарэтычнага матэрыялу студэнты праходзяць практыку пасля трэцяга і чацвёртага курсаў у вылічальных цэнтрах прамысловых прадпрыемстваў і арганізацый у абласных гарадах Беларусі.

Для інжынераў-эканамістаў 1974 год з'яўляецца першым выпускам у нашым універсітэце. У асобе М. Ткачова, Т. Быліна, Т. Івановай, В. Міхальчанка і многіх іншых краіна атрымае высокакваліфікаваных спецыялістаў.

Студэнты, якія атрымаюць спецыяльнасць інжынера-эканаміста, будуць працаваць у вылічальных цэнтрах міністэрстваў, ведамстваў, арганізацый, прадпрыемстваў, у НДІ, інжынерамі - праекціроўшчыкамі аўтаматычных сістэм кіравання.

**Ю. БАНДАРЭНКА,**
**загадчык кафедры арганізацыі механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі, кандыдат эканамічных навук.**

## ЭКАНАМІСТ ПА ПРАЦЫ

Больш 400 студэнтаў нашага факультэта набываюць спецыяльнасць эканаміста па працы.

Што ж гэта за спецыяльнасць і ў чым заключаецца сутнасць эканомікі працы як навукі?

Гэта навука разглядае арганізацыю грамадскай працы ў непарыўнай сувязі з палітыкай партыі і ўрада ў галіне працы. Яе метадам з'яўляецца гістарычны матэрыялізм, а тэарэтычнай асновай — марксісцка-ленінская палітычная эканомія. Эканоміка працы звязана з іншымі навуковымі дысцыплінамі — працоўным правам, фізіялогіяй і псіхіялогіяй працы, сацыялогіяй.

Студэнты гэтай спецыяльнасці, акрамя названых навуковых дысцыплін, вывучаюць таксама такія курсы, як «Планаванне народнай гаспадаркі СССР», «Эканоміка прамысловасці», «Арганізацыя і планаванне вытворчасці», «Статыстыка», «Тэхнічнае нармаванне», «Асновы навуковай арганізацыі працы» і іншыя эканамічныя дысцыпліны. Няпоўны іх пералік, але і той сведчыць, што студэнты ў перыяд навучання атрымоўваюць глыбокую тэарэтычую і прафесіянальную падрыхтоўку.

Пасля заканчэння ўніверсітэта эканамісты па працы накіроўваюцца на работу ў аддзелы працы і зарплаты прамысловых прадпрыемстваў, лабараторыі НАП і на іншыя эканамічныя службы.

Праца эканаміста — цікавая і творчая. Роля людзей гэтай прафесіі асабліва вялікая ў выкананні тых грандыёзных эканамічных задач, якія пастаўлены XXIV з'ездам КПСС перад народнай гаспадаркай.

**У. АРЭШЧАНКА,**
**загадчык кафедры эканомікі працы, дацэнт.**

## АПРАЎДВАЦЬ ЗВАННЕ СТУДЭНТА

Здаецца зусім нядаўна ў ліку першых мы здавалі ўступныя экзамены ва універсітэт. А сёлета ўжо — выпускнікі. Пяць гадоў студэнцкага жыцця праляцела вельмі хутка. У нашым жыцці яны пакінулі глыбокі след.

Упершыню пераступаючы парог харома навукі, мы прачыталі словы У. І. Леніна «...вучыцца, вучыцца і вучыцца...» Гэтыя словы сталі нашым дэвізам.

Галоўным кампанентам у фарміраванні спецыяліста з'яўляюцца веды. Без іх не можа быць ні тэхнічнай культуры, ні эрудыцыі, ні схільнасці да навуковай працы. Веды ж трэба здабываць крапатлівай, настойлівай працай. З першага дня вучобы неабходна ўстанавіць для сябе строгі рэжым і абавязкова выконваць яго. Планамерная праца над канспектамі і кнігамі, прагляд часопісаў і газет, засваенне шырокай сучаснай інфармацыі — паўсядзённая неабходнасць.

Са свайго вопыту лічу асабліва каштоўным удзел у студэнцкай навуковай рабоце. Гэта пашырае не толькі кругагляд, але дазваляе намнога глыбей, сапраўды па-творчаму тэарэтычна і практычна авалодаць выбранай спецыяльнасцю.

Мне не ўяўляецца студэнцкае жыццё і без актыўнай грамадскай дзейнасці. Яна неабходна для таго, каб атрымаць пэўныя арганізатарскія навыкі. Думаю, што сёлетнія выпускнікі паказвалі добры прыклад. Аб гэтым сведчаць іх шматлікія ўзнагароды, атрыманыя ад партыйных, савецкіх і партыйных органаў, грамадскіх арганізацый.

**В. ТРУХАЎ,**
**ленінскі стыпендыят.**

## НА БУДОЎЛЯХ ПЯЦІГОДКІ

Для студэнтаў нашага факультэта праца ў студэнцкіх будаўнічых атрадах, як і для ўсёй моладзі краіны, з'яўляецца неабходнай і ганаровай справай, сапраўднай школай загартоўкі. Кожнае лета мы поўны рашучасці аказаць пасільную дапамогу сельскім працаўнікам, будаўнічым арганізацыям, унесці свой уклад у датэрміновае выкананне заданняў дзевятай пяцігодкі.

У трэцім, працоўным семестры 1974 года прыме ўдзел чатыры лінейныя атрады нашага факультэта. СБА з традыцыйнай назвай «Эканаміст» (камандзір У. Бобрык, камісар К. Купрыяновіч) будзе працаваць на падшэфнай камсамольскай будоўлі ЦК ЛКСМБ на тэрыторыі легендарнай Рудабельскай рэспублікі. У трэці раз выедзе на камсамольскія будоўлі атрад «Альба» (камандзір У. Дзюбо, камісар М. Бордак). Сёлета яго байцы будуць працаваць ва Уральскай вобласці Казахскай ССР. Дзяўчаты з атрада паэтычнай назвы «Гамяльчанка» (камандзір В. Скурлова, камісар Е. Сямкова) зноў паедуць на сельскагаспадарчыя работы ў сонечную Малдавію. У меліярацыі беларускага Палесся прыме ўдзел атрад «Працаўнік» (камандзір А. Сасноў, камісар У. Драгуноў).

Нашы СБА заўсёды вызначаліся ўдарнай працай, займалі ў сацыялістычным спаборніцтве вядучыя месцы. Добрую традыцыю яны працягнуць і сёлета. Можна з цвёрдай упэўненасцю сказаць, што байцы ўсіх нашых атрадаў з гонарам выканаюць тыя задачы, якія пастаўлены перад імі на працоўны семестр-74.

**М. БОРДАК,**
**адказны за работу штаба працоўных спраў факультэта.**



**У працэсе навучання і практычных заняткаў студэнтам эканамічнага факультэта даводзіцца мець справу з самай разнастайнай аргтэхнікай.**

**НА ЗДЫМКУ: азнаямленне з электронна - вылічальнай машынай «Мінск-32».**

Фота студэнта-завочніка эканамічнага факультэта **В. Цярэшчанкі.**

## ЛЁГКА НА СЭРЦЫ АД ПЕСНІ ВЯСЁЛАЙ...

Мастацкая самадзейнасць нашага факультэта такая ж маладая, як і сам факультэт. Яна ўзнікла разам з ім. Крыху больш чатырох гадоў таму назад. Яе арганізатарамі сталі выдатныя рабяты —Анатоль Сердзюкоў, Валерый Петарсон, Віктар Літвінаў, Юрый Кліменцьеў, Ларыса Бандарэнка, Алег Цімашэнка. Усе яны былі тады яшчэ слухачамі падрыхтоўчага аддзялення. Сапраўднае жыццё мастацкай самадзейнасці пачалося з першага конкурснага канцэрта.

Штогод вельмі цікава праходзяць у нас вечары эканаміста. Яны звычайна выліваюцца ў свята нашых студэнтаў. На гэтых вечарах, як правіла, падводзяцца вынікі вучобы, грамадскай работы, спартыўных дасягненняў. І як справаздача — ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці даюць канцэрт. На сцэне асабліва цёпла вітаюць Люду Кайдала, Таню Селіванаву, Таню Мельнічэнка, Анатоля Сердзюкова. Гэтыя студэнты па-сапраўднаму любяць песні і імі заўсёды радуюць сваіх таварышаў, усіх гледачоў.

Вечары адпачынку ў нас праходзяць заўсёды жыва, цікава. Разнастайныя гульні, атракцыёны, конкурсы нікога не пакідаюць абыякавым, кожнаму ўзнімаюць настрой.

З вялікім жаданнем нашы самедзейныя артысты выязджаюць з канцэртамі да сельскіх працаўнікоў, у калектывы прадпрыемстваў горада.

**А. БАНДАРЭНКА,**

### ПАЭТЫЧНЫЯ СУСТРЭЧЫ

* * *

Издавна люди завидуют птицам.  
Высь голубая им снится, снится...  
Проснутся они — и вдохнут с тоскою,  
В небо глядят, заслонясь рукою,  
И вспоминают полёт Икара  
И поученье легенды старой.  
Знаете, как появились птицы?  
Века ползли, рассыпаясь пылью,  
И птицы-ящеры в небо взмыли!  
Я верю — может сбыться мечта,  
Если мечтать очень!  
Рожденный ползать станет летать,  
Только пускай захочет!

**Л. ТРАЦЭУСКАЯ,**
**першакурсніца.**

## ЗАГАРТОЎКА СПОРТАМ

Ва ўніверсітэце наш факультэт заваяваў усеагульнае прызнанне не толькі за дасягнені студэнтаў у вучобе, грамадскай рабоце, але і ў спорце. Мы па праву ганарымся майстрам спорту міжнароднага класа па лёгкай атлетыцы Надзеждай Марыненка, якая сёлета атрымае ўжо дыплом, майстрамі спорту, чэмпіёнамі рэспубліканскага студэнцкага таварыства па плаванню сталі Ларыса Янушкоўская і Ларыса Касцюшкевіч. Нашы валейбалісткі Наташа Жыгаліна і Таццяна Курыліна ўваходзяць у зборную каманду ўніверсітэта—уладальніцу Кубка БССР. Членамі зборных каманд рэспублікі з'яўляюцца будучыя эканамісты Юрый Ільеў, Валянціна Астапенка, Аляксандр Грамыка і іншыя вядучыя спартсмены.

Нашы студэнты паспяхова абараняюць гонар факультэта і на ўніверсіядах, якія штогод праводзяцца ў ГДУ. Так, летась яны заваявалі агульнае трэцяе месца, а па пастаноўцы спартыўна - масавай работы факультэт прызнан пераможцам.

На сёлетняй універсіядзе паспяхова выступілі нашы валейбольныя каманды, а таксама стралкі, стаўшыя чэмпіёнамі.

Па развіццю фізкультуры і спорту на факультэце вялікую работу праводзіць нізавы савет фізкультуры. Мы правялі сваю 2-ю факультэцкую спартакіяду, пераможцамі якой сталі першакурснікі (камсорг — Уладзімір Бобрык). Усе студэнты і выкладчыкі актыўна ўдзельнічаюць у здачы нарматываў комплекса ГПА.

Можна з упэўненасцю сказаць, што тыя, хто сёлета ўльецца ў студэнцкую сям'ю нашага факультэта, працягнуць яго слаўныя спартыўныя традыцыі.

**П. САКОВІЧ,**
**намеснік дэкана эканамічнага факультэта па спорту.**

# У ДРУЖБЕ З НАВУКАЙ

Як стаць добрым спецыялістам?

На гэта пытанне без запінкі вам адкажа пераважная большасць нашых студэнтаў. І справа вось у чым: ва ўніверсітэце трэба не толькі глыбока асвойваць вучэбны матэрыял, але ўжо з першага курса актыўна далучацца да студэнцкай навукова-даследчай работы. Будучыя эканамісты так і робяць.

На нашым факультэце стала традыцыяй праводзіць студэнцкія навуковыя канферэнцыі. На іх падводзяцца вынікі навуковых даследванняў за цэлы год. На гэтыя канферэнцыі, як правіла, запрашаюцца актыўныя члены СНТ іншых вну краіны. У нас, напрыклад, устанавіліся цесныя кантакты са студэнтамі-эканамістамі Беларускага дзяржаўнага інстытута народнай гаспадаркі імя В. В. Куйбышава і Вільнюскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя В. Капсукаса. На апошняй канферэнцыі студэнтаў-эканамістаў ГДУ было заслухана і абмеркавана каля 70 дакладаў. Леппшыя з іх былі пасланы сёлета на рэспубліканскі тур V Усесаюзнага конкурсу студэнцкіх навуковых работ па грамадскіх навуках, які прысвячаецца 50-годдзю прысваення камсамолу імя У. І. Леніна. Сярод гэтых работ 5 удастоены першай катэгорыі, 19 — другой і 7 — трэцяй. Асабліва высокай адзнакі журы заслужылі навуковыя даследаванні нашых студэнтаў В. Трухава, Н. Ісачанка, В. Брэліка.

Трынаццаць навуковых работ, якія падрыхтаваны членамі СНТ факультэта, адпраўлены на Ўсесаюзны конкурс па прыродазнаўчых, тэхнічных і гуманітарных навуках. Мы спадзяёмся, што яны таксама будуць высока ацэнены.

Нашы студэнты ўдзельнічаюць у навуковых студэнцкіх канферэнцыях, якія праводзяцца ў вну Мінска, гарадоў Прыбалтыкі. Іх даклады заўсёды выклікаюць вялікую цікавасць. І гэта не выпадкова: яны пішуцца на аснове глыбокіх даследаваннняў, якія ў пераважнай большасці праводзяцца на прамысловых прадпрыемствах Гомеля. Тэзісы лепшых дакладаў змешаны ў спецыяльных выданнях, а асобныя рэкамендаваны да публікацыі ў зборніку НТТ «Машиностроение».

На нашым факультэце ствараюцца ўсе ўмовы для таго, каб навукова-даследчая работа студэнтаў узнімалася на якасна новую ступень і яе вынікі былі яшчэ больш значнымі.

**А. ГРЫШАНАЎ,**
**студэнт другога курса, старшыня савета СНТ факультэта.**

## НАШЫ ЭТАПЫ




Малюнак **А. Цімашэнкі.**

СПРАВАЗДАЧЫ І ВЫБАРЫ Ў КАМСАМОЛЕ

# З ГЛЫБОКІМ АНАЛІЗАМ

407 камсамольцаў прысутнічала на справаздачна-выбарным сходзе камсамольскай арганізацыі нашага факультэта. Яны з увагай праслухалі даклад, з якім выступіў сакратар камсамольскага бюро Аляксандр Сасноў. Важак студэнцкай моладзі даў глыбокі аналіз дзейнасці камсамольскай арганізацыі за справаздачны перыяд. Асаблівае месца ён адвёў паспяховасці студэнтаў. І невыпадкова. Сёлета ў параўнанні з мінулагодняй яна некалькі знізілася. У гэтым перш за ўсё вінаватыя першакурснікі. Узровень іх паспяховасці — самы нізкі на факультэце.

Дакладчык адзначыў мэтанакіраваную ідэйна-палітычную работу, якая вядзецца сярод студэнтаў. На факультэце арганізавана прайшлі Ленінскія ўрокі, мітынг пратэсту супраць дэспатызму ваеннай хунты ў Чылі.

Студэнты актыўна падпісаліся на перыядычныя выданні, на вызначальны год дзевятай пяцігодкі ўзялі асабістыя планы. У хуткім часе будуць падведзены вынікі іх выканання.

На факультэце палепшылася работа СНТ, старшынёй якога з'яўляецца студэнт другога курса, дэпутат гарадскога Савета Аляксандр Грышанаў.

У дакладзе дадзена адзнака і рабоце добраахвотнай народнай дружыны, якую ўзначальваў Вячаслаў Драгуноў. У цэлым яна працавала нядрэнна. Між тым яе асобныя члены іншы раз не з'яўляліся на дзяжурствы, падводзілі не толькі сябе, але і сваіх таварышаў, факультэт.

Камсамольцы факультэта добра праводзілі свой адпачынак. Яны рэгулярна праводзілі вечары адпачынку, з цікавасцю прайшоў традыцыйны конкурс «Ану, першакурснікі!», задавальненне даставілі студэнтам і многія іншыя культурна-масавыя мерапрыемствы. Цяпер поўным ходам ідзе падрыхтоўка да ўніверсітэцкага агляду-конкурсу мастацкай самадзейнасці.

Аляксандр Сасноў паведаміў і аб тым, як прайшло фарміраванне новых будаўнічых атрадаў для работы на ўдарных камсамольскіх аб'ектах краіны, на палях Малдавіі.

Выступіўшыя ў спрэчках камсамольцы таксама гаварылі аб тым, што радуе, не маўчалі і пра недахопы.

Сход прызнаў работу камсамольскага бюро факультэта здавальняючай.

Выбраны новы састаў кіруючага камсамольскага органа. Яго сакратаром абраны студэнт першага курса Уладзімір Бобрык.

**Т. МАСЛАВА,**
**студэнтка групы Т-13**

*ДЛЯ ВАС, ВЫПУСКНІКІ*

# ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ МАЛАДОГА СПЕЦЫЯЛІСТА

**(З ПАЛАЖЭННЯ АБ ПЕРСАНАЛЬНЫМ РАЗМЕРКАВАННІ)**

Маладыя спецыялісты, якія закончылі вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы з адрывам ад вытворчасці, накіроўваюцца ў адпаведнасці з планам міжведамаснага і міжрэспубліканскага размеркавання на работу па спецыяльнасці і кваліфікацыі, набытымі імі ў навучальнай ўстанове.

Прадастаўленне работы маладым спецыялістам у планавым парадку — адна з гарантый забеспячэння права грамадзян СССР на працу, устаноўленага артыкулам 118 Канстытуцыі СССР. Работа ў адпаведнасці з назначэннем — грамадзянскі абавязак маладога спецыяліста.

Пры вызначэнні месцаў работы маладых спецыялістаў міністэрства (ведамствы) павінны ўлічваць даныя ім рэкамендацыі аб найбольш мэтазгодным выкарыстанні маладых спецыялістаў.

Персанальнае размеркаванне маладых спецыялістаў на работу праводзіцца камісіяй, зацверджанай міністэрствам або ведамствам.

Камісія па персанальнаму размеркаванню забяспечвае:

а) выкананне плана міжведамаснага і міжрэспубліканскага размеркавання маладых спецыялістаў;

б) прадастаўленне работы ўсім выпускнікам у адпаведнасці са спецыяльнасцю і кваліфікацыяй, набытымі ў навучальнай установе, з улікам атрыманай імі спецыялізацыі, акадэмічнай паспяховасці, сямейных абставін, стану здароўя, а таксама ўдзелу ў навукова-даследчай і грамадскай рабоце;

в) першачарговае накіраванне маладых спецыялістаў на прадпрыемствы, будоўлі і пускавыя аб'екты, якія маюць вострую патрэбу ў кадрах спецыялістаў.

Кожнаму маладому спецыялісту камісія паведамляе аб месцы работы (прадпрыемства або арганізацыя, гарадское (раённае) упраўленне або аддзел і г. д.), аб пасадзе, размеры заработнай платы, відзе прадастаўляемай жыллёвай плошчы. Камісія заслухоўвае і абмяркоўвае таксама асабістыя пажаданні маладога спецыяліста аб яго будучай рабоце.

Маладыя спецыялісты, якія не з'явіліся без уважлівых прычын у камісію па персанальнаму размеркаванню, размяркоўваюцца завочна.

Нязгода маладога спецыяліста з рашэннем камісіі па персанальнаму размеркаванню не вызваляе яго ад прыбыцця на работу па назначэнню.

Маладыя спецыялісты, якія маюць інваліднасць першай або другой групы, накіроўваюцца на работу з улікам стану іх здароўя па месцу пастаяннага жыхарства сям'і або з іх згоды на адно з месцаў, прапанаваных камісіяй.

Маладым спецыялістам, якія маюць бацькоў-інвалідаў першай або другой групы, пры адсутнасці ў сям'і іншых працаздольных членаў работа прадастаўляецца па іх просьбе па месцу пастаяннага жыхарства бацькоў.

Жонкам (мужам) ваеннаслужачых афіцэрскага і начальніцкага саставу, а таксама сержантаў і старшын звыштэрміновай службы прадастаўляецца работа па месцу пастаяннага праходжання службы іх мужамі (жонкамі) пры наяўнасці там работы па спецыяльнасці.

На супругаў ваеннаслужачых тэрміновай службы, а таксама курсантаў ваенных вучылішчаў дзеянне гэтага пункта Палажэння не распаўсюджваецца.

Маладым спецыялістам — жанчынам, у выпадку цяжарнасці або калі яны маюць дзіця ва ўзросце да аднаго года, работа прадастаўляецца па месцу пастаяннага жыхарства сям'і (мужа, бацькоў).

Супругам, якія заканчваюць вышэйшыя або сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы адначасова, работа прадастаўляецца на прадпрыемствах і ў арганізацыях, якія размешчаны ў адным горадзе або раёне. Калі адзін з супругаў заканчвае навучальную ўстанову раней, то яму прадастаўляецца работа на агульных падставах, з улікам будучага накіравання на работу ў той жа раён (горад) другога супруга, калі ж пазней — па месцу назначэння супруга.

Пры ўступленні маладых спецыялістаў у шлюб пасля заканчэння работы камісіі месца работы супругаў вызначаецца па дагаворанасці паміж міністэрствамі і ведамствамі, на прадпрыемствах і ў арганізацыях якіх ім прадастаўляецца работа, а ў выпадку рознагалосся — міністэрствам або ведамствам, у распараджэнні якога знаходзіцца навучальная ўстанова, зыходзячы з найбольш мэтазгоднага выкарыстання маладых спецыялістаў.

Калі камісія па персанальнаму размеркаванню ў выпадках, прадугледжаных пунктамі 12, 13, 14, 15 і 16 гэтага Палажэння, не можа прадаставіць работу маладому спецыялісту ў адпаведнасці з планам, яна накіроўвае маладога спецыяліста на работу па свайму меркаванню або па яго просьбе прадастаўляе магчымасць уладкоўвацца самастойна.

Кіраўнікі вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установаў абавязаны дапамагаць маладым спецыялістам, якім камісіяй па персанальнаму размеркаванню прадастаўлена магчымасць уладкоўвацца на работу самастойна, у падшуканні работы па спецыяльнасці.

Пасля заканчэння работы камісіі адхіліць або змяніць яе рашэнне можа толькі міністэрства.

Пасведчанне аб накіраванні на работу і грашовыя сродкі ўручаюцца маладым спецыялістам адначасова з дыпломам не пазней чым праз 5 дзён пасля заканчэння імі навучальнай установы. Персанальную адказнасць за несвоечасовае ўручэнне маладым спецыялістам пасведчанняў аб накіраванні на работу, грашовых сродкаў і дыпломаў нясуць кіраўнікі навучальных устаноў.

Даведкі аб прадастаўленні магчымасці самастойна ўладкоўвацца на работу (форма № 3) выдаюцца маладым спецыялістам у адпаведнасці з рашэннем камісіі па персанальнаму размеркаванню за подпісам кіраўніка навучальнай установы.

Спецыялісты з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй абавязаны працаваць пасля заканчэння навучання ў адпаведнасці з накіраваннем камісіі па персанальнаму размеркаванню і накіраваннем міністэрства (ведамства) не менш трох гадоў, акрамя тых спецыялістаў, для якіх устаноўлены ўрадам іншыя тэрміны работы.

Заўвага. Маладым спецыялістам з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, якія прызваны ва Узброеныя Сілы СССР, час знаходжання ва Узброеных Сілах СССР залічваецца ў тэрмін абавязковай работы па накіраванню пасля заканчэння навучальнай установы.

Кіраўнікам прадпрыемстваў і арганізацый на працягу 3 год пасля заканчэння маладымі спецыялістамі навучальнай установы забараняецца выкарыстоўваць іх у апараце кіраўніцтва, перамяшчаць на работы, якія не звязаны са спецыяльнасцю, а таксама звальняць з работы без дазволу міністэрства (ведамства), якому падпарадкавана данае прадпрыемства або арганізацыя.

Калі малады спецыяліст на працягу гэтага тэрміну па якой-небудзь прычыне не можа быць выкарыстан на прадпрыемстве або ў арганізацыі, куды ён накіраван камісіяй па персанальнаму размеркаванню, або прадпрыемства (арганізацыя) не забяспечвае выканання ўмоў працоўнага дагавору, зафіксаваных у пасведчанні аб накіраванні на работу, міністэрства (ведамства), у падпарадкаванні якога знаходзіцца данае прадпрыемства або арганізацыя, абавязана прадаставіць маладому спецыялісту ў сваёй сістэме іншую работу або па яго просьбе адкамандзіраваць на работу ў сістэму іншага міністэрства (ведамства) па ўзгадненню з гэтым міністэрствам (ведамствам).

Кіраўнікам прадпрыемстваў і арганізацый забараняецца прымаць маладых спецыялістаў на работу да сканчэння трох год пасля заканчэння навучальнай установы без пасведчання адпаведнага міністэрства (ведамства) або даведкі навучальнай установы аб прадастаўленні магчымасці самастойна ўладкоўвацца на работу.

Кіраўнікі міністэрстваў, ведамстваў, прадпрыемстваў і арганізацый нясуць адказнасць за правільнае выкарыстанне маладых спецыялістаў на рабоце ў адпаведнасці са спецыяльнасцю і кваліфікацыяй, атрыманымі імі ў навучальных установах, а таксама за стварэнне ім неабходных жыллёва-бытавых умоў і ўмоў для хуткага набыцця практычнага вопыту і павышэння кваліфікацыі.

Маладыя спецыялісты забяспечваюцца жыллёвай плошчай прадпрыемствам (арганізацыяй), у якое яны накіраваны пры размеркаванні.

Маладыя спецыялісты, якія накіроўваюцца на работу ва ўстановы асветы, культуры і аховы здароўя, гандлю, бытавога абслугоўвання, суда і пракуратуры, у выпадку адсутнасці ведамаснай жыллёвай плошчы, забяспечваюцца жыллёвай плошчай мясцовымі Саветамі дэпутатаў працоўных па хадайніцтву адпаведных устаноў і арганізацый.

Усім маладым спецыялістам, якія накіроўваюцца на работу пасля заканчэння навучальнай установы, прадастаўляецца да пачатку работы месячны водпуск незалежна ад таго, калі яны мелі апошнія канікулы ў навучальнай установе.

За час водпуску маладому спецыялісту выплачваецца дапамога ў размеры месячнай стыпендыі за кошт прадпрыемства, у якое ён накіроўваецца на работу. Заработная плата за час водпуску не выплачваецца.

Маладым спецыялістам, якія атрымалі магчымасць самастойна ўладкоўвацца на работу, дапамога за час водпуску не выплачваецца.

ПРАЦЯГВАЕМ ДЫСКУСІЮ:
ІНТЭРНАТ — ТВОЙ ДОМ

# УМЕЙЦЕ ДАРАЖЫЦЬ

Часта кажуць: «Ці то студэнт, калі ён не жыве ў інтэрнаце».

Сапраўды, не поўнасцю нам бачыцца жыццё студэнта без яго прысутнасці ў вялікай сям'і агульнага дома.

У нашым інтэрнаце жыве прыкладна 600 чалавек. Іх аб'ядноўвае адзіны калектыў. Хацелася б, каб у іх была і агульная адказнасць за парадак у інтэрнаце.

На нашым паверсе жывуць не толькі біёлагі, а і матэматыкі, геолагі, філолагі, слухачы падрыхтоўчага аддзялення. Сярод іх ёсць такія, якіх не хвалюе парадак: у пакоях часта бывае брудна, дрэнна дзяжураць на сваім паверсе. Крыўдна, што не навучыліся яны паважаць і бачыць прыгожае, хаця б у той жа чысціні і акуратнасці, добрасумленнасці ў выкананні сваіх абавязкаў. Здаецца, у такіх студэнтаў не можа быць парадку і ў іншых справах.

Вечарам у холе збіраюцца студэнты, каб адпачыць, паглядзець тэлевізар. І тады над блакітным экранам узнімаюцца блакітныя клубкі дыму, а акуркі ляцяць у вазонікі. Пасля тытунёвага дыму кветкі пачынаюць высыхаць. А ёсць жа на паверсе спецыяльныя месцы для курэння.

Вельмі хочацца, каб усе пражываючыя даражылі гонарам свайго паверха, свайго інтэрната.

**Т. КОСАРАВА,**
**стараста другога паверха інтэрната № 2.**



Фотаэцюд А. Рудчанкі.

## ЛЮБЫ КУТ

Як хораша сёння
На душы і на сэрцы.
Толькі любай яшчэ
Не хапае мне тут.
Да чаго ты харошы,
Да чаго ты прыгожы
Сінім вечарам,
Любы мой кут.

**МІХАСЬ КАМАРОЎСКІ.**

# ДЛЯ ТЫХ, ХТО ЛЮБІЦЬ НАШУ МОВУ

Зараз беларускую мову лічаць роднай больш сямі мільёнаў чалавек. На ёй выходзіць мноства газет і часопісаў, масавымі тыражамі выдаюцца творы мастацкай літаратуры, падручнікі і вучэбныя дапаможнікі, друкуюцца навуковыя працы, працуюць тэатры і школы, вядуцца тэле- і радыёперадачы, беларуская мова — афіцыйная мова ААН.

Як асобная і самастойная наша мова склалася ў перыяд Вялікага княства літоўскага. У яго сладзе беларускія землі мелі вялікую ўдзельную вагу як у эканоміцы і палітыцы, так і ў культурных адносінах. Тут на беларускай мове выдаваліся законы, вялося справаводства. Яна ўвайшла ва ўжытак феадальнай знаці, на ёй выкладалі ў школах. Захаваліся шматлікія пісьмовыя помнікі таго перыяду, напісаныя на беларускай мове. У поўным зводзе Літоўскай метрыкі налічваецца звыш 550 тамоў дзелавых дакументаў XIV—XVII стагоддзяў. На думку шматлікіх вучоных, пісьмовая спадчына беларускай мовы гэтага часу можа параўняцца з матэрыяламі рускай мовы, а па колькасці друкаванай прадукцыі нават пераўзыходзіць іх.

Цікавасць уяўляюць і беларускія тэксты, пісаныя арабскім пісьмом.

Вялікае значэнне ў гэты час мела дзейнасць беларускага першадрукара і асветніка Францыска (Георгія) Скарыны. Ён даў беларускаму народу друкаваную кнігу на яго роднай мове значна раней, чым Марцін Лютэр апублікаваў біблію на нямецкай мове, а Іван Фёдараў у Маскве надрукаваў «Апостал (1569, а па апошніх даных 1564 г.). Разам з кракаўскімі выданнямі Швайпольта Фіоля (1491), чарнагорскімі выданнямі ў сяле Обад (1493), а таксама чэшскім перакладам «Бібліі» (1506) «Біблія» Скарыны была адной з самых ранніх у славян і самай першай ва ўсходніх славян кнігай, надрукаванай не па-царкоўна-славянску, а ў перакладзе на нацыянальную мову.

Умовы для развіцця старабеларускай мовы пачалі зменьвацца ў горшы бок, калі пасля Люблінскай уніі 1569 г. Вялікае княства літоўскае аб'ядналася ў адну дзяржаву з Польскім каралеўствам. У 1696 г. польскі сейм забараніў выкарыстанне беларускай мовы як мовы дзяржаўнай. Яна захоўвала свае заваёвы папярэдніх перыядаў гісторыі ў вуснай форме.

Беларускія народныя казкі—выдатная з'ява ва ўсёй сусветнай фальклорнай спадчыне. Наша народная творчасць зрабіла прыкметны ўплыў на творчасць выдатных польскіх мастакоў слова, якія заўсёды з вялікай павагай адносіліся да беларускага народа і яго мовы. Класік польскай і сусветнай літаратуры Адам Міцкевіч, геній якога быў створан беларускім народам і прыродай, аб беларускай мове пісаў наступнае: «...гэта самая багатая і чыстая гаворка,...» Да нашага народа і мовы прыхільна адносіўся і Фрыдрых Энгельс.

Уз'яднанне Беларусі з Расіяй выратавала беларускі народ ад паланізацыі і растварэння ў Польскай дзяржаве. Але ён трапіў, як кажуць, з агню ды ў полымя. Прымусовая паланізацыя была заменена прымусовай русіфікацыяй.

## Кніжная паліца

Тым не менш, беларускі народ раздзяліў цяжкі сацыяльны лёс з рускім народам—старэйшым і кроўна бліжэйшым братам.

Новая беларуская літаратурная мова пачала ўжо інтэнсіўна ўніфікавацца ў першым дзесяцігоддзі XX стагоддзя. Асабліва вялікая роля ў стандартызацыі беларускай літаратурнай мовы выдатных беларускіх класікаў Я. Купалы, Я. Коласа.

Таму і не выпадковая ўзросшая ў апошні час унутры краіны і за мяжой цікавасць да беларускай культуры, і беларускай мовы. Каб паскорыць і паглыбіць гэты працэс, беларускія вучоныя-філолагі выдалі кнігу «Белорусский язык для небелорусов»[1], якая «з'яўляецца першай спробай выдання курса беларускай фанетыкі і граматыкі, разлічанай для чытача-небеларуса». Хоць гэта і не падручнік, але тут «спецыфічныя беларускія з'явы, якія ўяўляюць цяжкасць для чытача-небеларуса апісваюцца больш дэталёва, чым у існуючых дапаможніках па беларускай фанетыцы і граматыцы», што з'яўляецца каштоўным дадаткам да школьных і студэнцкіх падручнікаў.

Першы раздзел кніжкі — «Фанетыка і вымаўленне». Тут падрабязна апісваецца вымаўленне і гучанне галосных і зычных гукаў, змешчаны фотаздымкі становішча губ пры вымаўленні, палатаграмы, ахарактарызаваны прынцыпы напісання беларускай мовы, усе асноўныя гукі — 72, — якія перадаюцца ўсяго 32-ма літарамі. Нават складзена табліца адпаведнасцей паміж гукамі і літарамі.

У раздзеле «Марфалогія», як і заўсёды, перад разглядам часцін мовы ідзе іх агульная характарыстыка. У падраздзеле «Назоўнік» паўнатой апісання вылучаюцца «Назоўнікі сферы неадушаўлёных прадметаў і іх словаўтварэнне», у адно месца сабраны вынікі назіранняў за формай множнага ліку. Вывучэнню прыметнікаў таксама ўдзелена належная ўвага. Разглядваюцца дзевяць прызнакаў адносных і сем якасных прыметнікаў.

«Сінтаксіс». Гэты раздзел простаму сказу адводзіць 31 параграф, а складанаму—толькі адзін. Заслугоўваюць высокай ацэнкі «Сінтаксічнае выкарыстанне часоў дзеясловаў», разгляд выказніка, «Мадальнасць выказвання» і інш. Выдзелена восем спецыфічных асаблівасцей сінтаксічнай сувязі кіравання. Асабліва шмат спецыфік у сінтаксічнай сінаніміцы.

Вельмі добра, што кніга мае неабходную, хоць і невялікую, хрэстаматыю лепшых твораў беларускай літаратуры, а таксама фальклору, «Кароткі дыферэнцыяльны руска-беларускі слаўнік», «Размоўныя выразы» і «Выбраную бібліяграфію па беларусістыцы».

Названая кніга з'явіцца каштоўным дапаможнікам не толькі для вучняў сярэдняй школы, асабліва з рускай мовай навучання, але і для студэнтаў. Асноўнае ж яе назначэнне, як было ўжо сказана, — быць дапаможнікам для небеларусаў, якія жывуць ці не жывуць у Беларусі, маюць большае альбо меншае дачыненне да нашага народа і нашай роднай мовы.

**К. УСОВІЧ,**
**студэнт IV курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**

[1] Кривицкий А. А. и др. «Белоруский язык для небелорусов», Мн. «Вышэйш. школа». 1973, 272 стар.

СПОРТ СПОРТ

# УПЕРШЫНЮ—ПЕРШЫЯ

У Гомельскім дзяржаўным універсітэце стала традыцыяй віншаваць пераможцаў рэспубліканскіх і іншых буйных спаборніцтваў. На гэты раз «маланка» была выпушчана ў гонар гімнастаў. Яны ўпершыню заваявалі агульнакамандную перамогу на чэмпіянаце БССР па праграме XVII студэнцкай спартакіяды. Гамяльчане набралі 294 ачкі і здолелі апярэдзіць такія моцныя калектывы, як інстытут фізкультуры (256,5 ачка), БДУ (161,5 ачка) і іншыя каманды вну рэспублікі.

Асабліва ўдала выступілі мужчыны. Міхаіл Вартанян (ГДУ) набраў лепшую суму балаў у абавязковай праграме, а пасля вольнай — падняўся на другую прыступку п'едэстала гонару. Трэцім прызёрам па праграме майстроў спорту стаў яго таварыш па камандзе Валерый Быўшаў.

Міхаіл і Валерый святкавалі перамогу і на асобных снарадах: Вартанян быў лепшым на брусах, Быўшаў — у апорным скачку.

Сярод кандыдатаў у майстры лепшую суму балаў — 109,7 — набраў Уладзімір Зязюля (ГДУ).

Паспяхова выступілі і гімнасткі Гомельскага ўніверсітэта, якія ў камандным заліку мацнейшых заваявалі трэцяе месца.

# АДКРЫЛІ СЕЗОН

Цёплыя красавіцкія дні дазволілі адкрыць спартыўны сезон мацнейшым веласіпедыстам нашага горада. На старт выйшла больш двухсот аматараў гэтага віду спорту.

У першы дзень праходзілі камандныя гонкі. Сярод жанчын на дыстанцыі 20 кіламетраў і сярод дзяўчат — на 15 не было роўных веласіпедысткам Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Яны намнога апярэдзілі сваіх асноўных канкурэнтак.

Больш напружана праходзіла групавая гонка сярод юнакоў (на 25 км.) і мужчын (на 30 км.). На гэтых дыстанцыях перамаглі адпаведна каманды таварыства «Працоўныя рэзервы» і БІІЧТу.

У другі дзень адбыліся групавыя гонкі. Сярод дзяўчат з далёкім адрывам ад саперніц першымі 20-кіламетровую дыстанцыю закончылі студэнткі ГДУ першаразрадніцы Таццяна Лаёк і Юлія Бухман.

Жанчыны вялі гонку на 30-кіламетровай дыстанцыі. Хутчэй за ўсіх яе пераадолела кандыдат у майстры спорту Аня Слесарчук (ГДУ).

У групавых гонках юнакі стартавалі на 40 км. Чэмпіёнам на гэтай дыстанцыі стаў дынамавец кандыдат у майстры спорту Анатоль Бондараў.

Мацнейшым сярод мужчын на 50-кіламетровай дыстанцыі быў спартакавец кандыдат у майстры спорту Аляксандр Якаўцаў.

Па выніках двухдзённай барацьбы агульнакамандную перамогу на прыз адкрыцця сезону ўпэўнена заваявалі спартсмены ГДУ.

**А. БАРЫСЮК,**
**трэнер каманды, майстар спорту СССР.**

# ЗА ПУЦЁЎКУ Ў ФРУНЗЕ

У лесапарку пад Гомелем адбыўся фінал XIII рэспубліканскага кроса на прыз газеты «Праўда». На старт выйшлі і мацнейшыя лёгкаатлеты нашага ўніверсітэта.

У бегу юнакоў на 3000 м з вынікам 9.25,2 трэцяе месца заняў Віктар Калачоў. На такой жа дыстанцыі ў групе юніёраў з вынікам 8.51,8 другім прызёрам стаў Уладзімір Якутовіч.

Жанчыны спаборнічалі на 2-кіламетровай дыстанцыі. Усяго тры секунды прайграла пераможцы студэнтка нашага ўніверсітэта Валянціна Астапенка. А трэцяй была на фінішы яе сяброўка па камандзе Тамара Ляўкоўская.

Вялікую цікавасць выклікалі спаборніцтвы мужчын на дыстанцыі 8000 м. Вопытным красменам дастойную канкурэнцыю аказаў Генадзій Высоцін, які паказаў трэці вынік.

У камандным заліку сярод зборных абласцей упершыню перамаглі красмены Гомельшчыны, а сярод таварыстваў лепшы вынік у «Буравесніка». Вельмі прыемна што вялікі ўклад у гэтыя дасягненні ўнеслі спартсмены ГДУ.



ПРАРЫЎ.

Фота А. Рудчанкі.

### ПАПРАЎКА

У артыкуле «Разведчыкі нетраў», які быў змешчаны ў папярэднім нумары нашай газеты, пры наборы прапушчана тры радкі. У чацвёртым абзацы (знізу) трэба чытаць: ...як дацэнты, кандыдаты навук Ю. Ф. Хадакоўскі, М. К. Бабкоў, былыя выдатнікі вучобы, выпускнікі ГДУ, а цяпер выкладчыкі кафедры А. Ф. Акулевіч, Г. А. Сербін, В. П. Хайнак, В. Е. Сіліч і г. д., як у тэксце.

За дапушчаную недакладнасць рэдакцыя просіць прабачэння ў аўтара артыкула і чытачоў.

**Рэдактар Ул. БАЛОГА.**

АЗ 02219 «Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ, профкома и месткома Гомельского государственного университета (на белорусском языке). Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш, Фармат 300×420 мм. Тыраж 2000 экз.
заказ 2797